Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛІПЕНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 143 (27258) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Здароваму харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай супрацоўніка Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні, доктара медыцынскіх навук Элеаноры Капітонавай.**

СТАР. 8



**27—28 ліпеня ў Калінкавіцкім раёне ладзіцца чарговы, сёмы па ліку, фестываль народнага гумару «Аўцюкі-2012», і на яго, як плануецца, з'едуцца гумарысты з усіх куточкаў краіны.**

СТАР. 8

## СІСТЭМА НАЦБЯСПЕКІ ПАВІННА ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ АПЕРАТЫЎНАЕ РЭАГАВАННЕ НА ЛЮБЫЯ ВЫКЛІКІ

**Сістэма нацыянальнай бяспекі Беларусі павінна забяспечваць адэкватнае і аператыўнае рэагаванне на любыя выклікі і пагрозы. Аб гэтым заявіў 26 ліпеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб стане работы па прывядзенні Узброеных Сіл і Дзяржпагранкамітэта Беларусі ў адпаведнасць з сучаснымі патрабаваннямі.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў пачатку года была дамоўленасць на працягу прыкладна паўгода разгледзець пытанні рэфармавання і прывядзення сіл забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў адпаведнасць з сучаснымі патрабаваннямі. Прэзідэнт дадаў, што ў хуткім часе плануецца разгледзець таксама пытанні ўдасканалення структуры органаў пракуратуры і іх узаемадзеяння са Следчым камітэтам, рыхтуюцца канкрэтныя прапановы па рэфармаванні сістэмы органаў унутраных спраў, выпрацоўваюцца шляхі далейшага ўдасканалення дзейнасці іншых сілавых органаў і структур.

У цэнтры ўвагі цяперашняй нарады былі пытанні забеспячэння ваеннай і пагранічнай бяспекі.

«Тое, што мы ўдзяляем вялікую ўвагу гэтай рабоце, абумоўлена перш за ўсё міжнароднай абстаноўкай. Мы жывём у вядомы час. З'яўленне новых геапалітычных выклікаў, эканамічных і палітычных пагроз бяспецы сталі характэрнымі рысамі сучаснага свету. Ва ўмовах глабалізацыі любыя негатыўныя тэндэнцыі распаўсюджваюцца вельмі хутка, нягледзячы на геаграфічныя межы», — сказаў Прэзідэнт. На думку кіраўніка дзяржавы, прыкладаў таго дастаткова — гэта сітуацыя на Блізкім Усходзе, у Сірыі, націск на Іран і іншыя.

«На змену традыцыйным спосабам вядзення вайны прыходзяць спецыяльныя, у тым ліку інфармацыйна-псіхалагічныя, аперацыі і падрыўныя акцыі. У іх усё часцей задзейнічаны добра падрыхтаваныя групы экстрэмісцкай накіраванасці. Пад патранажам шматлікіх арганізацый, фармальна дзеючых пад флагам распаўсюджвання дэмакратыі, вырошчваюцца, кансалідуюцца і накіроўваюцца ў патрэбнае замежным гаспадарам рэчышча ўнутраныя дэструктыўныя сілы».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія рэаліі вымушаюць кіраўніцтва Беларусі больш пільна сачыць за станам сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі і аператыўна прымаць рашэнні па ключавых пытаннях.

«Гэта асабліва важна ў перыяд правядзення палітычных кампаній, калі найбольш актывізуюцца знешнія і ўнутраныя нядобразычліўцы, мякка кажучы», — лічыць Прэзідэнт.

«Восенню нам трэба будзе правесці чарговыя парламенцкія выбары. Гэта якраз той момант, калі адбываецца актывізацыя як за межамі краіны, так і ўнутры тых, хто страшна ненавідзіць нашу Беларусь і каму не падабаецца існуючы стан спраў. Задача ўсіх тут прысутных забяспечыць магчымасць свабоднага волевыяўлення грамадзян у спакойнай абстаноўцы і ў строгай адпаведнасці з беларускімі законамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запатрабаваў ад міністра абароны далажыць аб бягучым стане спраў беларускай арміі. «Неабходна даць прынцыповую ацэнку, наколькі яе аблічча адпавядае патрабаванням сучаснасці, якія існуюць праблемныя пытанні ў яе мадэрнізацыі і развіцці, якія шляхі іх вырашэння найбольш мэтазгодны ў кантэксце нашых эканамічных магчымасцяў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся, як выконваюцца яго даручэнні, дадзеныя пры зацвярджэнні рашэння на забеспячэнне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэнне пагранічнай бяспекі краіны на гэты год, ці ўсё робіцца ў тэрмін, з належнай актыўнасцю і ініцыятывай.

«Канкрэтна быў дадзены шэраг даручэнняў, каб мы пільна паглядзелі на ўжо рэфармаваную некалькі гадоў таму беларускую армію, таму што сітуацыя, мы гэта бачым і па арабскай вясне, і па Сірыі, сёння імгненна змяняецца, і армія павінна быць прыстасавана да гэтай сітуацыі, калі не дай бог што здарыцца», — адзначыў Прэзідэнт.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, сённяшняя сітуацыя не надзвычайная, аднак ёсць некаторыя насцярожваючыя моманты: «Адзначаны рост злачыннасці, у тым ліку карупцыйнай, у тым жа пагранічным ведамстве, што недапушчальна».

«Як растлумачыць правакацыю з лёгкаматорным самалётам, які не толькі перасёк граніцу, але і беспакарана праляцеў на тэрыторыю Беларусі? Гэта ж у першую чаргу — бяспека нашых грамадзян. Гэты самалёт быў своечасова выяўлены. Але чаму начальнікі не спынілі яго палёт? Каго шкадавалі? Гэта галавацяпства канкрэтных выканаўцаў або памылкі ў самой сістэме аховы дзяржаўнай граніцы ў паветранай прасторы? Я хацеў бы пачуць адказы на гэтыя пытанні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Пры гэтым хачу сумленна і адкрыта сказаць тым, хто вельмі цікавіцца гэтым пытаннем і прысутным тут: вінаватыя ў гэтым павінны адказваць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — З прыняццем рашэнняў, як бачыце, я не спяшаўся па вашай просьбе. Вы хацелі гэты выпадак дасканала расследаваць. Як я бачу, ён расследаваны, і вінаватыя за гэта павінны панесці адказнасць. Мною будзе прынята рашэнне пасля гэтай нарады, у тым ліку і кадравыя рашэнні».

«Вынікам комплексу прымаемых мер павінна стаць паслядоўнае ўмацаванне сістэмы нацыянальнай бяспекі і забеспячэнне адэкватнага аператыўнага рэагавання на любыя выклікі і пагрозы, адкуль бы яны ні ішлі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнікі Міністэрства абароны і Дзяржаўнага пагранічнага камітэта далажылі Прэзідэнту аб прывядзенні Узброеных Сіл і падраздзяленняў пагранведамства ў стан, адпаведны сучаснай абстаноўцы.

Па выніках нарады вызначаны канкрэтныя меры па эфектыўным забеспячэнні нацыянальнай бяспекі Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Сяброўскія скокі ў Бярэзінскія вытокі



**Докшыцкія дзеці бавяць вольны час у гарадскім вадасховішчы, з якога пачынаецца рака Бярэзіна.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВЫПРАБАВАННЕ СПЯКОТАЙ: +34!

### А на наступным тыдні яшчэ і моцныя ліўні

**У пятніцу на тэрыторыю Беларусі зноў завітаюць вельмі цёплыя паветраныя масы з боку поўдня Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Сёння толькі месцамі магчымы невялікі дождж, часам навальніца. Максімальная тэмпература паветра 28—34 градусаў. Сур'ёзная гарачыня будзе гаспадарыць у Беларусі 28 і 29 ліпеня. Уначы на выхадныя пераважна без ападкаў, а ўдзень невялікія кароткачасовыя дажджы і часам навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 15—22, а ўдзень 29—34 цяпла.

У першы дзень наступнага тыдня да заходніх рэгіёнаў краіны падыдуць сур'ёзныя атмасферныя франты. Таму ў панядзелак на захадзе чакаюцца навальнічныя дажджы, у асобных раёнах моцныя ліўні; а пры навальніцах узмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы на панядзелак 15—22, удзень — 28—34, аднак на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей не вышэй за 24—27 градусаў.

У аўторак 31 ліпеня гэты франтальны падзел будзе рухацца далей на ўсход краіны. Таму дажджы ўжо чакаюцца амаль паўсюдна, месцамі моцныя ліўні. Пры навальніцах моцны парывісты вецер. Усталюецца рэзка кантрасны тэмпературны фон, калі на захадзе Беларусі максімальная тэмпература не больш за 21 цяпла, а на ўсходзе — яшчэ да 33 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у першы дзень жніўня зона істотных ападкаў накрые і ўсходнія рэгіёны Беларусі. Адразу пасвяжэе. Уначы чакаецца 10—17 цяпла, толькі ў Гомельскай вобласці да плюс 20, удзень — 20—27 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У БЕЛАРУСІ СКАРАЧАЕЦЦА КОЛЬКАСЦЬ ПРАВЕРАК

**Адпаведны ўказ № 332 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 ліпеня.**

Дакумент накіраваны на рэалізацыю палажэнняў Дырэктывы ад 31 снежня 2010 года № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь», а таксама рашэння чацвёртага Усебеларускага народнага сходу аб наданні кантрольнай (наглядной) дзейнасці максімальна прафілактычнага (папераджальнага) характару і скарачэнні колькасці праверак. У гэтых мэтах ва ўказ ад 16 кастрычніка 2009 года № 510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» уносіцца шэраг змяненняў і дапаўненняў.

Так, уводзіцца новая форма кантролю (нагляду) — маніторынг, які заключаецца ў назіранні, ацэнцы ўмоў дзейнасці суб'ектаў у мэтах выяўлення і прадухілення прычын і ўмоў, якія садзейнічаюць учыненню парушэнняў. Гэты кантроль будзе праводзіцца без выкарыстання службовымі асобамі паўнамоцтваў, прадастаўленых ім для правядзення праверак, і выпатрабавання дакументаў у суб'ектаў. Рашэнне аб правядзенні маніторынгу мае права прыняць толькі кіраўнік кантралюючага (наглядного) органа або яго ўпаўнаважаны намеснік. У выпадку выяўлення ў ходзе маніторынгу парушэнняў суб'екту будуць уручацца рэкамендацыі па іх ліквідацыі. Пры добраахвотным устараненні парушэнняў не будуць назначацца пазапланавая праверка і прымяняцца меры адказнасці да суб'екта і яго службовых асоб.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генеральны дырэктар славенскай кампаніі «Рыка» Янез ШКРАБЕЦ:**

***«Цяперашняя сітуацыя асабліва шкодзіць прадстаўнікам еўрапейскіх бізнэс-структур. Бо Беларусь, наткнуўшыся на закрытыя з боку Еўрасаюза дзверы, будзе шукаць іншыя выхады, якія, магчыма, будуць нават больш выгаднымі. А Еўропа будзе варыцца ў сваім саку».***

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +32° |
| Віцебск | + 29° |
| Гомель | + 32° |
| Гродна | + 31° |
| Магілёў | + 28° |
| Мінск | + 31° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.07.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8290,00 | ▼ |
| Еўра | 10070,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 254,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1025,20 | ▼ |

## КОРАТКА

Паводле аператыўных звестак, колькасць насельніцтва Беларусі на 1 ліпеня гэтага года склала 9 млн 457,5 тыс. чалавек. Аб гэтым паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У параўнанні з 1 студзеня 2012 года жыхароў краіны стала менш на 7,7 тыс. чалавек.

Першыя 78,1 тыс. т. збожжа новага ўраджаю паступілі ў лік дзяржзаказу, што складае 6,6 працэнта запланаванага, паведамілі ў дэпартаменце па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі.

Купіць білеты ў плацежных тэрміналах на праезд у пасажырскім аўтатранспарце можна ў 55 гарадах і населеных пунктах Беларусі, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства транспарту і камунікацый. Продаж білетаў арганізаваны больш як на 2 тыс. плацежна-даведачных тэрміналах, размешчаных па ўсёй рэспубліцы.

## ШОПІНГ ПА-МАГІЛЁЎСКУ: КІРМАШ З МУЗЫКАЙ

У суботу 28 ліпеня ў Магілёве пройдзе кірмаш «Зроблена на Магілёўшчыне». Ён разгорнецца на пляцоўцы каля Палаца культуры вобласці а 10-й раніцы. Больш за тры дзясяткі прадпрыемстваў і арганізацый з рэгіёна прапануюць магілёўцам сваю прадукцыю — харчаванне і прамысловыя тавары. Асартымент абяцаюць шырокі, цэны — прымальныя, смачную ежу гарантуе грамадскае харчаванне, а настрой падтрымаюць калектывы народнай творчасці.

**Ілона ІВАНОВА.**

ГУМ

ОАО "ГУМ" поздравляет коллег с профессиональным праздником- Днем работников торговли!

г.Минск
пр.Независимости,21
тел.(8 017) 226 10 48
(8 029) 304 50 45
www.gum.by



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ІРАН АБВІНАВАЦІЎ ІЗРАІЛЬ У АРГАНІЗАЦЫІ ПАДРЫВУ АЎТОБУСА Ў БУРГАСЕ

Іран аспрэчыў абвінавачванні ў датычнасці да падрыву аўтобуса з ізраільскімі турыстамі ў Балгарыі і абвінаваціў у здзяйсненні гэтага тэракта сам Ізраіль. Выступаючы ў чацвер у Савеце Бяспекі ААН, пастаянны прадстаўнік Ірана пры сусветнай арганізацыі Махамед Хазаі заявіў, што Тэгеран «асуджае тэрарызм у любой форме і праявах» і ніякім чынам не датычны да тэракта ў Балгарыі.

Нагадаем, што турыстычны аўтобус з групай ізраільцян быў падарваны 18 ліпеня ў аэрапорце Бургаса. У выніку 7 чалавек загінулі, больш за 30 атрымалі раненні.

«Мы ніколі не былі і не будзем уцягнутыя ў такі подлы замах на жыцці нявінных людзей», — цытуе словы іранскага амбасадара ІТАР-ТАСС. «Такая тэрарыстычная аперацыя магла быць спланавана і здзейснена толькі тым жа самым рэжымам, кароткая гісторыя якога напоўнена тэрарыстычнымі аперацыямі і замахамі, накіраванымі на ажыццяўленне сваіх вузкіх палітычных гульняў», — заявіў Хазаі падчас адкрытых дэбатаў СБ ААН па блізкаўсходніх праблемах. У сваю чаргу намеснік пастаяннага прадстаўніка Ізраіля Хаім Ваксман катэгарычна абверг заявы Хазаі, назваўшы іх «шакіруючымі, але не нечаканымі». «У нападзе ў Балгарыі вакол іранскія сляды, яны ж у апошнія месяцы прыкметныя і ў дзясятках іншых тэрарыстычных актах, прынамсі, у 24 краінах пяці кантынентаў», — заявіў ізраільскі амбасадар журналістам пасля пасяджэння Савета бяспекі. «Прыйшоў час свету раз і назаўжды пакласці канец гэтай кампаніі тэрору», — дадаў ён.

### СКЛАДЗЕНЫ РЭЙТЫНГ БЯСПЕКІ РЭГІЁНАЎ РАСІІ

Вывучыўшы статыстыку і публікацыі ў СМІ, эксперты выставілі ўсім расійскім рэгіёнам ацэнкі ад 0 да 100 — чым вышэйшы бал, тым больш спакойна могуць спаць мясцовыя жыхары. Пры разліках улічваліся не толькі крымінальная абстаноўка, але і экалагічная сітуацыя ў рэгіёне, а таксама разнастайныя надзвычайныя здарэнні і стыхійныя бедствы — катастрофы, пажары, паводкі. Найбольш бяспечнымі прызнаныя Пензенская вобласць (93,5 бала), Мардовія (93,3 бала) і Ямала-Ненецкая аўтаномная акруга (93,2 бала). Там і крымінальная статыстыка не зашкальвае, і сур'ёзных здарэнняў за апошні год не было. А вось рэспублікі Паўночнага Каўказа другі год запар знаходзяцца ў аўтсайдарах рэйтынгу: Чачня па ўзроўні бяспекі атрымала 42 балы і знаходзіцца на 81-м месцы з 83, Дагестан — 41,8 бала (82-е месца), а Інгушэцця з 35,4 бала заключае спіс усіх 83 рэгіёнаў Расіі.

Што тычыцца горада Масквы і Маскоўскай вобласці, то тут сітуацыя пакідае жадаць шмат лепшага, хоць, у адрозненне ад вобласці, Масква стаіць у рэйтынгу вышэй амаль на 30 пунктаў — на 46-м месцы (79,4).

### ЭКВАДОР ПРЫМЕ РАШЭННЕ АБ ПАЛІТЫЧНЫМ ПРЫТУЛКУ ДЛЯ ДЖУЛІЯНА АСАНЖА

Аўстраліец ужо больш за месяц знаходзіцца на тэрыторыі Пасольства Эквадора ў Лондане, куды ён прыбыў 19 чэрвеня і дзе звярнуўся з просьбай прадаставіць яму палітычны прытулак. Прэзідэнт Эквадора Рафаэль Карэа заявіў, што гэты выпадак вельмі сур'ёзны і патрабуе ўважлівага вывучэння, а пад увагу павінны быць прыняты як довады Асанжа і яго адвакатаў, так і пазіцыя Вялікабрытаніі, Швецыі і ЗША, перадае ІТАР-ТАСС.



«Мы прымем рашэнне, якое не сапсуе нашы адносіны з Вялікабрытаніяй. Яно, магчыма, разыдзецца з пазіцыяй брытанскага ўрада, але мы праявім асцярожнасць, каб не аказаць уздзеяння на Алімпійскія гульні», — заявіў кіраўнік МЗС Эквадора Рыкарда Паціньё.

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЯПОНСКІЯ ЖАНЧЫНЫ СТРАЦІЛІ 1-Е МЕСЦА Ў СПІСЕ ДОЎГАЖЫХАРАК З-ЗА ЛЕТАШНЯГА ЗЕМЛЯТРУСУ



Японія саступіла Ганконгу першынство ў рэйтынгу працягласці жыцця жанчын пасля землятрусу ў сакавіку 2011 года, паведамляе Reuters со спасылкай на паведамленне ўрада Японіі.

Катастрофа, ахвярамі якой сталі каля 20 тысяч чалавек, знізіла сярэднюю працягласць жыцця ў Японіі на 0,4 года, гаворыцца ў штогадовым дакладзе японскага Міністэрства аховы здароўя. Цяпер яна складае 85,9 года, што дазволіла Ганконгу, у якім гэты паказчык зараз роўны 86,7 года, выйсці тут у лідары. На зніжэнне сярэдняй працягласці жыцця ў Японіі таксама паўплывала павелічэнне колькасці суіцыдаў летась. Да гэтага Японія 26 гадоў запар узначальвала спіс краін з самай вялікай працягласцю жыцця жанчын.

## З ЯКІМІ ЛЮДЗЬМІ НАШАГА ЦІ МІНУЛАГА ЧАСУ ВЫ ХАЦЕЛІ Б ПАЗНАЁМІЦЦА?



**Мікіта КУДРАШОЎ, аспірант БДУ, бас-гітарыст:**

— Я хацеў бы сустрэцца з Джонам Ленанам — дакрануцца да феномена Beatles, зразумець, як удалося стварыць такі гурт. І цікава было б пабачыцца не толькі з ім, але і з усімі ўдзельнікамі гурта, калі яны толькі-толькі сабраліся, паглядзець, як усё зараджалася. Ленан меў шмат сяброў, якім пасля дапамагаў, яны таксама былі музыкантамі, аднак нічога не дасягнулі, а ў яго ўсё атрымалася...

Я пабачыўся б і з Ленанам, і з Макартні, бо менавіта яны «рулілі» ў Beatles.

Таксама пазнаёміўся б з Аляксандрам Башлачовым — адным з пачынальнікаў рускага року. Ён не стаў славутым, не паспеў шмат зрабіць. Башлачоў перагарэў, як і многія яскравыя людзі, і зразумела, ад чаго: ад душэўных пакут і ад гарэлкі. Ён выступаў як паэт і музыкант, аднак важная была не столькі музыка, колькі сіла падачы, яго харызма. Гэта быў дар звыш — чалавек знутры ззяў праўдай, прымушаў думаць. Для пакалення 1990-х ён з'яўляецца знакавай асобай у плане паэзіі.

Я проста марыў бы пабываць у яго на «кватэрніку», у звычайнай савецкай хрушчоўцы, дзе, я ўпэўнены, усё было б вельмі душэўна...



**Наталля ПАЎЛЮКЕВІЧ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ:**

— З Маркам Шагалам хацела б убачыцца. Мяне ён зацікавіў пасля знаёмства з працай Аляксандра Каменскага «Паэтыка Марка Шагала» і выставай яго рэпрадукцый на плошчы Якуба Коласа. Я не ведаю іншых мастакоў родам з Беларусі, якія сталі б вядомымі на ўвесь свет.

Мы маглі б сустрэцца дзе-небудзь у галерэі, дзе выстаўляліся яго работы, і пагутарыць пра карціны з самім майстрам.

Цікава было б пазнаёміцца і з акцёрам Іванам Ахлабысціным. Але ён мяне прываблівае больш не як акцёр, а як асоба з такой незвычайнай і цікавай біяграфіяй. Ён быў святаром, але, каб пракарміць сваю вялікую сям'ю (шасцёра дзяцей), змяніў род дзейнасці на акцёрскую кар'еру...



**Аляксей КІРЫЛІЧАЎ, студэнт фізічнага факультэта БДУ:**

— Я пазнаёміўся б з якім-небудзь гістарычным дзеячам, які моцна паўплываў на Беларусь. І добра, каб гэта была неадназначная асоба, з якой можна весці спрэчкі, імкнучыся высветліць праўду.

Напрыклад, з Каліноўскім: хтосьці кажа, што ён не мае дачынення да Беларусі, што ён быў палякам і змагаўся за польскую незалежнасць, а нехта сцвярджае, што ён адстойваў нашу свабоду... Можна ўзгадаць і Гітлера, і Сталіна. Я сустрэўся б з імі, каб даведацца, якімі яны былі людзьмі насамрэч, чаго праглі. Былі яны тыранамі або ідэалістамі, якія не змаглі дасягнуць сваіх мэтаў цывілізаваным шляхам?..

**Падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

# У БЕЛАРУСІ СКАРАЧАЕЦЦА КОЛЬКАСЦЬ ПРАВЕРАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з тым пры ўстанаўленні парушэнняў, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю, кантралюючы (наглядны) орган зможа ў рэгламентаваным парадку вынесці патрабаванне (прадпісанне) аб прыпыненні (забароне) дзейнасці суб'екта.

З сферы кантрольнай (наглядная) дзейнасці выводзяцца мерапрыемствы тэхнічнага (тэхналагічнага, праверачнага) характару, якія ажыццяўляюцца органамі ў адносінах да суб'ектаў, але не звязаныя з праверкамі іх дзейнасці. Канкрэтны пералік гэтых мерапрыемстваў будзе вызначаны ўрадам па ўзгадненні з кіраўніком дзяржавы.

Пры гэтым указам устаноўлена прамая забарона на правядзенне планавых і пазапланавых праверак па гэтых мерапрыемствах, што дасць магчымасць скараціць колькасць праверак суб'ектаў, а таксама аптымізаваць работу па складанні каардынацыйных планаў кантрольнай (наглядная) дзейнасці.

Таксама змяняецца перыядычнасць назначэння планавых праверак. Пры адсутнасці парушэнняў заканадаўства планавыя праверкі будуць праводзіцца не часцей як адзін раз у пяць гадоў незалежна ад аднясення суб'ектаў да якой-небудзь групы рызыкі.

Удасканальваецца парадак вылічэння тэрміну для назначэння планавай праверкі. Гэты тэрмін будзе вылічацца кантралюючым (наглядным) органам з дня заканчэння папярэдняй планавай праверкі, праведзенай не толькі гэтым органам, але і яго вышэйстаячым органам, іх структурнымі падраздзяленнямі (тэрытарыяльнымі органамі, падпарадкаванымі арганізацыямі). У выніку выключана магчымасць правядзення мноства праверак аднаго суб'екта ў рамках сістэмы (вертыкалі) аднаго і таго ж кантралюючага (наглядная) органа.

Прадугледжаны права Камітэта дзяржаўнага кантролю выключаць з каардынацыйных планаў кантрольнай (наглядная) дзейнасці праверкі, якія не адпавядаюць нормам указа № 510, і абавязак кантралюючых (наглядных) органаў уносіць у базу даных інтэграванай аўтаматызаванай сістэмы кантрольнай (наглядная) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь звесткі не толькі аб назначэнні праверак, але і аб іх выніках.

Дадаткова ўказам карэктуюцца асобныя палажэнні ўказа № 510 з улікам практыкі яго прымянення. У прыватнасці, замацоўваецца дадатковая падстава для правядзення праверак у перыяд устаноўленага двухгадовага маратորыя на іх правядзенне — наяўнасць інфармацыі аб ажыццяўленні здзелак з асобамі, у дзейнасці якіх устаноўлены прыкметы лжэпрадпрымальніцтва. Пералік кантралюючых (наглядных) органаў, якія ажыццяўляюць пазапланавыя тэматычныя аператыўныя праверкі, дапаўняецца Міністэрствам аховы здароўя, органамі і ўстановамі, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, па пытанні выканання заканадаўства ў галіне забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Акрамя таго, удакладняюцца ўстаноўленыя крытэрыі рызыкі ў мэтах абгрунтаванага аднясення правяраемых суб'ектаў да адпаведных груп рызыкі для назначэння планавых праверак.

Указ уступае ў сілу з 1 кастрычніка 2012 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

# «ТРЭБА ШУКАЦЬ АПТЫМАЛЬНЫЯ РАШЭННІ»

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў у час наведвання ААТ «Мінскі маторны завод» (ММЗ) акцэнтаваў увагу на перспектывах развіцця вытворчасці, навуковых распрацоўках і сацыяльнай сферы, перадае БЕЛТА.**

Аляксандр Радзькоў азнаёміўся з работай цэхаў завода, паразмаўляў з рабочымі. Генеральны дырэктар завода Мікалай Лобач расказаў аб дзейнасці прадпрыемства і планах, а таксама існуючых праблемах. У прыватнасці, размова ішла аб будаўніцтве ў Стоўбцах, дзе ўжо дзейнічае філіял завода, цэха па высокадакладным і высокатрывалым чыгунным ліцці. Тэрміны пачатку будаўніцтва цэха неаднаразова пераносіліся з-за таго, што праектная арганізацыя своечасова не падрыхтавала праектную дакументацыю.

У размове з журналістамі, якая адбылася ўчора на тэрыторыі завода, Аляксандр Радзькоў растлумачыў, што наведванне прадстаўнікамі дзяржаўных органаў прадпрыемстваў — гэта не разавая акцыя, а пастаянная мэтанакіраваная работа. «Мы глядзім прадпрыемствы розных профіляў, узроўню, эканамічнага становішча. Маторны завод — гэта вядомае прадпрыемства, прычым далёка за межамі нашай краіны: яго прадукцыя пастаўляецца ў краіны СНД, Польшчу, Германію. Важна, каб на прадпрыемстве, якое мае багатыя традыцыі, бачылі перспектывы развіцця», — сказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Дзелячыся ўражаннямі ад убачанага ў цэхах, размоў з яго кіраўніцтвам і рабочымі, Аляксандр Радзькоў выказаў задавальненне работай завода, атмасферай у працоўным калектыве, падтрымкай сацыяльнай сферы, а таксама планамі развіцця. Паводле яго слоў, асаблівае значэнне мае тое, што завод плануе адкрыць новую вытворчасць у Стоўбцах, што прынясе не толькі эканамічную выгаду прадпрыемству, але і створыць новыя рабочыя месцы для жыхароў райцэнтра. Акрамя таго, адкрыццё цэха дасць штуршок і развіццю навуковых распрацовак.

Як растлумачыў Мікалай Лобач, у новым цэху будзе прымяняцца нямецкая лінія. У сувязі з гэтым першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў важнасць правядзення ўласных навуковых распрацовак, падрыхтоўкі спецыялістаў па кіраванні высокатэхналагічнымі лініямі вытворчасці. «Гэта няпростае пытанне: ці варта кааперавацца, распрацоўваць свае тэхналогіі або ісці па шляху набыцця імпартных», — сказаў ён, дадаўшы, што і ў гэтым напрамку трэба шукаць найбольш аптымальныя рашэнні.

Паводле слоў Аляксандра Радзькова, на прадпрыемстве створана спакойная дружалюбная рабочая атмасфера, што таксама мае першараднае значэнне. Дэвізам завода па праве могуць стаць словы аднаго з плакатаў, размешчаных у адным з цэхаў: «Наша галоўная мэта — якасць, наша галоўная каштоўнасць — чалавек!». Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што на такіх прадпрыемствах, як ММЗ, дзе забяспечваецца ў тым ліку і дастойны ўзровень зарплаты, людзі з задавальненнем працуюць, даражаць дружбай з калегамі, адчуваюць сябе часткай моцнага калектыву і гордасць за сваю краіну і прадпрыемства.

■ Парламенцкія выбары-2012

# АКТЫЎНАСЦЬ ПАРТЫЙ ЗНІЗІЛАСЯ

**Пра гэта паведаміла ўчора Лідзія Ярмошына, старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.**

## УСЯГО 66 ПАРТЫЙЦАЎ

Палітычныя партыі праявілі нізкую актыўнасць на этапе падачы заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. Усяго свае ініцыятыўныя групы зарэгістравалі 330 патэнцыйных кандыдатаў. Аднак толькі 66 з іх заявілі аб прыналежнасці да той ці іншай палітычнай партыі. А вось у мінулыя парламенцкія выбары, па словах Лідзіі Ярмошынай, такіх было 115 чалавек: «А значыць актыўнасць палітычных партый знізілася практычна ў 2 разы».

Атрымалася, што ініцыятыўныя групы па зборы подпісаў выбаршчыкаў зарэгістравалі 25 членаў Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», 9 прадстаўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі («Грамада»), 5 — Аб'яднанай грамадзянскай партыі, па адным — ад Беларускай аграрнай партыі, Беларускай партыі «Зялёныя», Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, Ліберальна-дэмакратычнай партыі. «Акрамя таго, пяць грамадзян, якія вылучаюцца шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў, з'яўляюцца членамі Камуністычнай партыі Беларусі і 18 — партыі «Беларускі народны фронт», паведаміла кіраўнік ЦВК.

## НАЗІРАЛЬНІКІ

Ужо зарэгістравана 220 нацыянальных назіральнікаў. «Трое былі акрэдытаваны ў Цэнтральнай выбарчай камісіі, астатнія — у акруговых», — патлумачыла Лідзія Ярмошына. Дарэчы, 152 назіральнікі былі накіраваны грамадскімі аб'яднаннямі, 47 — шляхам збору подпісаў, ад палітычных партый — толькі 5. ЦВК таксама акрэдытаваў 14 міжнародных назіральнікаў ад місіі СНД.

## ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАЎ СТАЛА МЕНШ

Працэс фарміравання ўчасткаў для галасавання на выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пятага склікання завяршыўся 21 ліпеня. «Усяго будзе працаваць 6349 участкаў з улікам замежных, — заявіла кіраўнік ЦВК. — Аднак у параўнанні з выбарамі 2008 года колькасць выбарчых участкаў скарацілася — тады іх было 6525». На гэта паўплывалі дэмаграфічныя фактары і ўдасканаленне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Цяпер, пасля акрэслення межаў участкаў, пачнецца фарміраванне ўчастковых камісій. Да 5 жніўня ўключна будзе праходзіць вылучэнне прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій. Вылучаць сваіх прадстаўнікоў могуць палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы і грамадзяне шляхам падачы подпісаў. Да 8 жніўня ўчастковыя камісіі будуць сфарміраваны.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Арсеній КРЫЦКІ:

# «Помнік беларусам-маракам як прыклад народнай дыпламатыі»

**Сёння ў гісторыка-культурным цэнтры «Лінія Сталіна» адкрыецца мемарыял «Маракам зямлі беларускай — ад удзячнай Расіі!»**



Ідэя стварэння помніка належыць ветэранам Ваенна-марскога флоту Расіі і Беларусі і з'яўляецца выдатным прыкладам народнай дыпламатыі і сяброўства паміж брацкімі народамі.

Міжнародны праект «Марское братэрства — непарушнае!» ужо каля трох гадоў займаецца праблемай адраджэння беларускай марской славы. Цікава, што сродкі на помнік і мерапрыемствы, звязаныя з увекавечаннем маракоў-беларусаў, выдаткоўвалі не толькі расіяне і нашы суайчыннікі, але і швейцарцы — прыхільнікі сусветнай марской ваенна-гістарычнай спадчыны.

— Маракі — гэта мужчыны, якія ніколі не здрадзяць, не ўключаць «заднюю хуткасць». А беларусы — самыя выдатныя з іх! — мяркуе аўтар праекта «Марское братэрства — непарушнае!» Арсеній Крыцкі.

Арганізатары акцыі сцвярджаюць, што гэта толькі пачатак пошуку невядомых старонак беларускай марской гісторыі. У далейшым плануецца пашыраць гэты праект па меры паступлення новых экспанатаў.

**Надзея БУЖАН, фота аўтара.**

■ Ну і ну!

## Жанчыны... кусаюцца

**Дзве жанчыны пакусалі адна адну, і справа дайшла да суда. Інцыдэнт адбыўся ў Полацкім раёне на тэрыторыі дачнага таварыства. 62-гадовая пенсіянерка хацела выліць нечыстоты ў вадаём пажарнага прызначэння, які знаходзіцца на зямельным участку 54-гадовай суседкі. Апошняя зрабіла заўвагу, а пенсіянерка выліла нечыстоты суседцы на галаву і... укусіла суседку за палец. А пацярпелая ўкусіла «суперніцу» за брыво.**

— Падчас расследавання крымінальнай справы было ўстаноўлена, што паміж жанчынамі даўно ўзнік канфлікт. Пастаянна сварыліся. Прыгаворам суда 62-гадовая жанчына была аштрафавана на 3,5 мільёна рублёў, а 54-гадовая — на 4 мільёны. Жанчыны, у сваю чаргу, патрабавалі адна ад адной кампенсацыі за прычыненую маральную шкоду і страту здароўя, — расказвае Віталій Сузанскі, старшы пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Віцебскай вобласці. — У выніку 62-гадовая жанчына была абавязана выплаціць 4 мільёны рублёў, а яе суседка — 5 мільёнаў. Але ж абласны суд згодна з законам аб амністыі, вызваліў пенсіянерку ад пакарання. У выніку яна нічога не заплаціла, але кампенсацыю ад суседкі атрымала.

## Шпалеры на 2,5 мільярда

**Супрацоўнікі Віцебскай мытні ў пункце пропуску «Урбаны» ў грузавым аўтамабілі «Мерседэс», які рухаўся з Латвіі ў Расію, знайшлі буйную партыю тавару, які вывозіўся незаконна.**

Пры правядзенні мытнага дагляду грузавога аўтамабіля з паўпрычэпам, у якім, згодна з суправаджальнымі дакументамі, вадзіцель перавозіў з Латвіі ў Расію плёнку для паліграфіі агульнай вагой больш за 20 тон, было ўстаноўлена, што насамрэч перавозіліся дарагія шпалеры італьянскага вытворчасці. Па папярэдняй ацэнцы, кошт грузу складае каля 2,5 мільярда беларускіх рублёў. Па факце гэтага правапарушэння распачаты адміністрацыйны працэс.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** ■

■ Дабрачыннасць

# ЦІ ВЕРНУЦЦА СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ НА РАДЗІМУ?

**Слуцкі краязнаўчы музей абвясціў дабрачынную акцыю па зборы сродкаў для набыцця двух слуцкіх паясоў з прыватнай калекцыі мінскага калекцыянера.**

Як вядома, Слуцк — радзіма славутых паясоў, якія прынеслі гораду і Беларусі сусветную вядомасць. Цяпер шэдэўры знаходзяцца ў многіх краінах: Расіі, Украіне, Францыі, Польшчы, Літве, Германіі і нават у Злучаных Штатах Амерыкі. **У Беларусі захоўваецца толькі пяць арыгінальных паясоў, вытканых менавіта ў Слуцку, і шэсць** — выробленых на ўзор слуцкіх у майстэрнях іншых гарадоў. Унікальныя творы прыкладнога мастацтва ў сваіх калекцыях маюць пяць айчынных музеяў: Мінскі абласны краязнаўчы (г. Маладзечна), Нацыянальны гістарычны, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Чым абумоўлена ініцыятыва па зборы сродкаў, расказала «Звяздзе» **дырэктар Слуцкага краязнаўчага музея Наталля Серык:**

— Для жыхароў нашага раёна, як і рэспублікі ў цэлым, слуцкія паясы не толькі прадмет дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, гэта наш нацыянальны гонар. Але, на жаль, у Слуцку няма ніводнага цэлага пояса. У нас захоўваюцца толькі невялікія фрагменты. Таму як толькі мы даведаліся, што прыватны калекцыянер мае намер прадаць рарытэты, не маглі ўпусціць магчымасць іх набыць. Нашу ініцыятыву падтрымала і кіраўніцтва раёна, і дэпутаты, і грамадскасць. У выніку перамоў уладальнік пагадзіўся прадаць паясы менавіта Слуцку, была дасягнута дамоўленасць па цане. Кошт аднаго пояса — каля 90 тыс. долараў.

**— Наталля Георгіеўна, цікава, чаму ў даўнія часы просты чалавек не мог насіць такую прыгажосць. Магчыма, дзейнічалі нейкія абмежаванні на заканадаўчым узроўні?**

— У тыя часы набыць слуцкія паясы маглі толькі заможныя людзі, шляхта, бо каштавалі яны дорага — ад 50 да 100 дукатаў. І насілі іх як дадатак да дарагога касцюма — кунтуша. У нашым музеі ёсць цікавы фотаздымак, зроблены ў Варшаве: шляхціч у кунтушы, паверх якога завязаны слуцкі пояс. Так што слуцкія паясы былі ў модзе і ў Рэчы Паспалітай.

Штогод фабрыка выпускала каля 200 вырабаў. Гэта няшмат, калі ўлічыць, што пры тым жа Яну Маджарскім тут працавала 28 станкоў і 60 рабочых.

**— У вядомым вершы Максіма Багдановіча гаворыцца пра нялёгкі лёс слуцкіх ткачых. Але гістарычныя факты сведчаць, што на фабрыцы працавалі толькі мужчыны. Існуе нават легенда: калі рука жанчыны дакранецца да пояса, ён страціць свае фарбы, паліняе.**

— Гэта ўсяго толькі прыгожая легенда. Спачатку для працы на фабрыцы запрасілі самых выдатных майстроў з Турцыі і Персіі. Але праз некаторы час князь накіраваў мясцовых маладых рабочых Я. Гадоўскага і Т. Хаецкага ў Станіслаў для навучання (у тую пару Станіслаў славіўся вытворчасцю паясоў). Менавіта адтуль было завезена і абсталяванне для фабрыкі — некалькі ткацкіх станкоў. Пазней на фабрыку прыйшлі мясцовыя майстры. Да нашых дзён дайшлі іх прозвішчы — Іосіф Барсук, Міхаіл Баранцэвіч, Лойка, Канчыла і інш.

А мужчыны, мяркую, займаліся вырабам паясоў таму, што тут была цяжкая вытворчасць. У поясе выкарыстоўваліся залатыя, сярэбраныя ніткі, іх пракатвалі на спецыяльных станках, таму паясы называлі літымі. І жанчыне такая праца была не па сілах чыста фізічна.

**— Ці не выставіў вам цяперашні ўладальнік паясоў абмежаванняў па тэрміне збору сродкаў?**

— Нам хацелася б сабраць сродкі як найхутчэй. У верасні ў Слуцку ладзіцца свята горада, да гэтай даты добра было б арганізаваць выставу набытых паясоў у асобнай зале, паказаць фотаздымкі, расказаць аб гісторыі стварэння шэдэўраў. У музеі захоўваецца толькі пяць фрагментаў і здымак слуцкага пояса з Расійскага этнаграфічнага музея, які нам перадалі яшчэ ў савецкія часы. Ён экспанаваўся ў нас на працягу 15 гадоў, але ў 2003-м яго забралі назад. Мы плануем зрабіць наведванне выставы бясплатным, паколькі на набыццё рарытэтаў «скідваецца» ўвесь горад. Калі задумы не спраўдзяцца, то прымяркуем выставу да юбілею музея, якому ў лістападзе спаўняецца 60 гадоў.

**— Калі не сакрэт, як ідзе збор сродкаў?**

— Людзі адгукнуліся на наш зварот, мы вельмі ўдзячны ім за разуменне і падтрымку. Грошы пералічваюць і прадпрыемствы, і грамадскія арганізацыі, і жыхары. Сваю лепту ў агульную справу ўнеслі і работнікі музея.

***Пералічваць грошы можна на рахунак: 3604000000562 у філіяле 615 ААТ «АСБ Беларусбанк», код 808, УНП 690305921, атрымальнік плацяжу ДУ «Слуцкі краязнаўчы музей».***

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## АБЗАЦ

◢ **У Гродзенскай вобласці 12 экіпажаў камбайнаў намалацілі больш за тысячу тон збожжа. Такую ж колькасць зерня перавезлі 18 кіроўцаў.**

◢ Мінская вобласць у першым паўгоддзі зарабіла на продажы і арэндзе зямельных участкаў Br60,3 млрд.

◢ **Два браты рамантавалі купал Свята-Успенскай царквы ў вёсцы Паніквы Камянецкага раёна. 52-гадовы мужчына сарваўся з даху і зваліўся. Пацярпелы (жыхар Бярозы) быў дастаўлены ў бальніцу, дзе памёр.**

◢ Крымінальнай справы па факце скалечвання бакланаў не будзе. Такое рашэнне прыняла пракуратура Чашніцкага раёна пасля вывучэння матэрыялаў, атрыманых ад міліцыі. Аднак былі заўважаны прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння — жорсткае абыходжанне з жывёламі. У выніку РАУС перадаў матэрыялы ў Лукомльскі сельскі Савет для складання пратакола аб адміністрацыйным правапарушэнні ў дачыненні да жыхара Чашніцкага раёна. Як паведамлялася, 16 чэрвеня на адным з азёраў Чашніцкага раёна дзясяткам птушанят бакланаў адрэзалі верхнюю частку дзюбы. Міліцыя знайшла зламысніка. Асоба, якая праходзіць па справе, скалечыла птушак дзеля грошай.



Фота БЕЛТА.

◢ **Раніцай 26 ліпеня пад Гродна ў аварыю трапіў «МАЗ», гружаны пладова-ягаднымі вінамі. Ён вёз прадукцыю са Слоніма ў абласны цэнтр. На момант прыезду на месца здарэння супрацоўнікаў ДАІ кіроўца быў нецвярозы. Медыцынскі агляд выявіў амаль чатырохразовае перавышэнне колькасці алкаголю ў арганізме мужчыны.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У заходняй Швецыі паліцыі забаранілі выліваць канфіскаваныя алкагольныя напоі ў каналізацыю з-за небяспекі атручэння мясцовых водных рэсурсаў. Такое рашэнне прынята акруговай адміністрацыйнай радай, каб упэўніцца ў тым, што крыніцы вады максімальна чыстыя. Рашэнне звязана з вялізным павелічэннем у апошнія гады колькасці канфіскаванага алкаголю. Як сведчаць звесткі паліцэйскай і мытнай службаў, толькі за апошні год кантрабанда алкаголю на заходнім узбярэжжы павялічылася ў 4 разы. Знішчэнне канфіскаванага спіртнога ўяўляе вялікую праблему для ўлад. Да гэтага кантрабандны алкаголь папросту выліваўся, а тара выкарыстоўвалася паўторна. Пакуль выйсце не знойдзена, вывучаюцца розныя прапановы.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НОВАЯ ПЛОШЧА ДЛЯ ГОРАК

| 19 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 2 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003688 | 1,1656 | для строительства и обслуживания многофункционального комплекса с объектами культурно-просветительского и зрелищного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, включая объекты общественного питания и торговли (объект неустановленного назначения) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 835 187 640 | 167 037 520 | 3 294 224 |
| 20 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 10 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003692 | 0,1533 | для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (магазин смешанной торговли на 100 кв.м торговой площади), (объект розничной торговли) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 109 844 100 | 21 968 820 | 2 976 175 |
| 21 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 4 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003690 | 0,2117 | для строительства и обслуживания здания специализированного общественного питания (объект общественного питания) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 151 689 450 | 30 337 890 | 2 823 210 |
| 22 | в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 3 по генплану, первая очередь застройки) | 340100000008003689 | 0,7277 | для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (универсам), (объект розничной торговли) | | Ограничений в использовании нет. | 50 | 521 419 040 | 104 283 808 | 3 207 824 |
| 23 | ул. 1- я Луначарского | 340100000008003732 | 1,1337 | для строительства и обслуживания многофункционального торгового комплекса (объекта розничной торговли) | | Ограничения в использовании – водоохранная зона р. Сож. | 50 | 2 191 460 270 | 438 292 000 | 7 026 614 |
| 24 | ул. Ильича (четная сторона) | 340100000007005117 | 0,0052 | для эксплуатации и обслуживания торгового павильона в составе остановочного комплекса «Кристалл» (объекта неустановленного назначения) | | Ограничения в использовании: охранная зона водопровода и самотечной канализации – 0,0052 га. | 3 | 1 105 240 | 221 000 | 0 |
| 25 | ул. Жукова | 340100000006004665 | 0,1362 | для строительства зданий: или специализированного для розничной торговли, или общественного питания, или специализированного по ремонту и техническому обслуживанию автомобилей | | Ограничения в использовании: водоохранная зона р. Сож, охранная зона линии электропередачи напряжением 35 киловольт, электрокабеля, сетей и сооружений канализации. | 50 | 332 053 445 | 66 400 000 | 2 205 640 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту.

3. **Аукцион состоится 31 августа 2012 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.5 представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.6 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 27 августа 2012 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а (каб. № 4). Заключительная регистрация участников аукциона с 14-00 до 14-40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Лоты №№ 1, 2, 3, 9, 10, 24, 25 выставляются на аукцион повторно. Извещения опубликованы в газете «Звязда» 3.05.2012 г., 16.05.2012 г., 22.05.2012 г.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27; факс: 77 48 85.**

**Наш сайт – www.gorod.gomel.by**

---

07 августа 2012 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О внесении изменений и дополнений в Устав общества и утверждение устава в новой редакции.

2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой» г. Брест, ул. Базановой, 19.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Базановой, 19.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 01.08.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

---

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ЛИДСКАЯ ОБУВНАЯ ФАБРИКА»

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение (инв. № 420/С-37864) – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – блок складов, площадью 440,5 кв.м, объем здания 1666 куб.м, материал стен – кирпич, год постройки – 1930, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, полы – бетонные, электроснабжение – скрытая проводка, вентиляция – естественная, внутренняя отделка – без отделки. |
| **Местонахождение объекта** | Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, 6, корп. 32 |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение (инв. № 420/С-35601) – одноэтажное кирпичное здание складов (А 1/к), площадью 421,9 кв.м, объем здания – 1727, год постройки – 1930, материал стен – кирпичные, фундамент – бутобетонный, крыша – шифер, полы – бетон, дощатые, электроснабжение – скрытая проводка, вентиляция – естественная, внутренняя отделка – без отделки |
| **Местонахождение объекта** | Гродненская область, г. Лида, ул. 8 Марта, 20А |
| **Составные части и принадлежности** | 1. Участок канализационной сети от здания КК-1-КК2-КК-3-КК-4 до КК-5 (трубопровод безнапорный, материал труб – керамика, диаметр 200 мм).<br>2. Ограждение (сплошные ж/б плиты, L=55,3 м, h=2,3 м).<br>3. Линии электропередачи (участки линий электропередачи от здания к зданию, напряжением 0,4кВ, силовые кабеля АВВГ 4*2,5 и 2*2).<br>4. Проезжая часть (асфальтобетон, площадью 1169,9 кв.м) и проезжая часть (бетон, площадью 434,7 кв.м) |
| **Земельный участок** | 423650100007000810, расположенный по адресу: Гродненская область, Лидский район, ул. 8 Марта, д. 20А. Назначение – обслуживание производственной территории |
| **Начальная цена продажи** | 354 291 200 (триста пятьдесят четыре миллиона двести девяносто одна тысяча двести) белорусских рублей без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 35 429 120 (тридцать пять миллионов четыреста двадцать девять тысяч сто двадцать) белорусских рублей |
| **Продавец** | ОАО «Лидская обувная фабрика», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел./факс 8-0154-52-16-61 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 6 августа 2012 г. в 14.30 по адресу: Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, 6**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**
**Последний день приема заявлений – 3 августа 2012 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

# МАРОЗІВА З КАКОСАВЫМ АЛЕЕМ НЕ ШКОДНАЕ

**Здароваму харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай галоўнага навуковага супрацоўніка аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні, доктара медыцынскіх навук Элеаноры КАПІТОНАВАЙ.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ці варта палохацца, калі ў састаў прадукту ўваходзіць какосавы алей?**

— Какосавы алей — адна з разнавіднасцяў раслінных тлушчаў, які шырока прымяняецца ў харчовай прамысловасці. Какосавы алей атрымліваюць са здробненай мякаці какосавых арэхаў метадам халоднага прасавання. Як і любы алей, какосавы можа быць неачышчаным (нерафінаваным) або прайсці цыкл ачысткі, пасля чаго становіцца празрыстым і практычна не мае ні паху, ні смаку, хоць свае карысныя біялагічныя вартасці захоўвае.

У какосавым алеі прысутнічаюць тлушчараствaральныя вітаміны А і Е. Асаблівасцю з'яўляецца тое, што гэты алей мае мяккую кансістэнцыю пры тэмпературы 15-200 градусаў. Іншыя тлушчы для іх ператварэння з вадкай у больш густую кансістэнцыю гідрагенізуюць, у працэсе чаго ўтвараюцца «шкодныя» трансізамеры тлустых кіслот. Какосавы алей у гэтым сэнсе «чысты», таму менавіта яго вельмі любяць выкарыстоўваць для вырабу марозіва і рознай глазуры.

Апошнім часам у літаратуры трапляюцца звесткі аб тым, што какосавы алей можа нанесці шкоду арганізму. Аднак дакладных навуковых даследаванняў на гэтую тэму няма. Акрамя таго, мы не ўжываем какосавы алей лыжкамі! Упэўнена, што выкураная цыгарэта або чарка гарэлкі наносяць арганізму непараўнальна большую шкоду.

**Ці можна ўжываць хлеб з пратэрмінаваным тэрмінам годнасці, але без цвілі?**

— Тэрміны захоўвання хлеба адлічваюцца з моманту выхаду вырабу з печы. Звычайна жытні хлеб захоўваюць не больш за паўтара сутак, пшанічны — суткі. Небяспека пры працяглым захоўванні хлеба заключаецца ў развіцці так званай «бульбяной хваробы» — асаблівага віду цвілі. Тады мякіш становіцца цягуча-мяккім, распаўзаецца ў пальцах. Такі хлеб, зразумела, да ўжывання не годны.

Калі ж хлеб проста счарсцвеў, то есці яго можна. Можна яго і «аднавіць», абрызгаць вадой і пакласці на 1-2 хвіліны ў мікрахвалевую печку. А можна дасушыць далей — атрымаюцца сухары.

Каб хлеб захоўваўся даўжэй, у спякотнае надвор'е можна выкарыстоўваць халадзільнік. А вось у поліэтыленавых пакетах хлеб лепш не захоўваць — пры вялікай вільготнасці і высокай тэмпературы там вельмі хутка будуць размнажацца любыя бактэрыі і грыбкі.

Тэхнолагі раяць свежы бохан хлеба ці батона рэзаць з сярэдзіны. Калі неабходная порцыя адрэзана, складзіце «хвасты» разрэзам да разрэзу — так хлеб захавае сваю свежасць даўжэй.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Ліга чэмпіёнаў

# КАЛІ НІЧЫЯ — ТАКСАМА ПЕРАМОГА

**Насуперак намерам «фанаў» македонскага «Вардара» барысаўскі БАТЭ аформіў выхад у трэці кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў.**

Шчыра кажучы, за БАТЭ было крыху трывожна перад другой сустрэчай беларуска-македонскага супрацьстаяння. Тыдзень таму мы ўжо згадвалі, як цяжка цяпер чэмпіёну даецца кожная вікторыя.

Яшчэ загадзя гаспадары паабяцалі барысаўчанам «гасцінны» прыём — аншлаг на адрэканструяваным Нацыянальным стадыёне «Філіп II Македонскі». І не дзіўна, бо ў аўторак прадалі апошнія з 33 тысяч квіткоў! Між іншым, гэта толькі другі кваліфікацыйны раўнд. Сустрэцца ў ім з еўрапейскім грандам — вялікая рэдкасць. Але падобны інтарэс да сустрэчы выклікае павагу. Як аказваецца, і ў гэтай невялічкай балканскай краіне нам, разбалаваным «Рэалам», «Барселонай і «Ювентусам», таксама ёсць чаму павучыцца.

Калі ў Барысаве айчынных балельшчыкаў вытанчанай сімуляцыяй насмяшылі футбалісты «Вардара», на гэты раз сваімі паводзінамі здзівілі балканскія фанаты і тэлевізіёншчыкі. Першыя так марылі аб перамозе роднай каманды, што нават арганізавалі начны, «партызанскі», кідок да атэля «Aleksandar Palace», дзе пасяліўся стратэгічны праціўнік. План у «вынаходлівых» хлопцаў быў просты — напужаць беларусаў песнямі пра любімчыкаў, вывесці з раўнавагі і проста не даць заснуць. У выніку сотня балельшчыкаў з паўгадзіны пабадзялася з барабанамі і знікла ў цемры. Македонскае тэлебачанне таксама зрабіла «геніяльна» і прапанавала беларусам купіць за мільён еўра трансляцыю гульні! Аказваецца, яны проста пакрыўдзіліся за тое, што беларускія калегі не далі ім «карцінку» з барысаўскай гульні. У выніку самыя адданыя прыхільнікі БАТЭ падтрымлівалі на стадыёне, а астатнія — сачылі за матчам праз інтэрнэт. Сенсацыі, на якую так спадзяваліся македонцы, не адбылося. 0:0 — нічыя, якая дазволіла нашаму чэмпіёну прайсці далей. Цяпер на шляху БАТЭ венгерскі «Дэбрэцэн».

**Тарас ШЧЫРЫ**

Даты | Падзеі | Людзі

***Дзень сістэмнага адміністратара — прафесійнае свята адміністратараў карпаратыўных і хатніх сетак, паштовых сістэм, праграмных комплексаў. Адзначаецца ў апошнюю пятніцу ліпеня.***

**1600** год — нарадзіўся Гіём Баплан, французскі інжынер-фартыфікатар, картограф. У 1630—1648 гадах служыў у арміі Рэчы Паспалітай у чыне капітана артылерыі. Пабудаваў шэраг крэпасцяў. Падчас шматлікіх падарожжаў сабраў багаты гістарычны, геаграфічны і этнаграфічны матэрыял, які пасля апублікаваў. Гіём Баплан таксама стварыў карты тэрыторый Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны, якія неаднаразова друкаваліся ў розных варыянтах да сярэдзіны XVIII ст. і цяпер з'яўляюцца важнымі гістарычнымі дакументамі. У карце «Вялікае Княства Літоўскае і Белая Русь» упершыню ў гісторыі картаграфіі назва «Беларусь» вынесена ў загаловак.



**1911** год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Кузняцоў, легендарны савецкі разведчык, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 года быў у партызанскім атрадзе Д. Мядзведзева «Пераможцы», які дзейнічаў на ўкраінскім Палессі. Пад іменем нямецкага обер-лейтэнанта Паўля Зіберта вёў разведку ў г. Роўна (Украіна), збіраў і перадаваў у партызанскі атрад каштоўныя звесткі і дакументы. Разам з партызанамі здзяйсняў дыверсіі, даставіў у партызанскі атрад некалькі нямецкіх генералаў і чыноўнікаў. Загінуў у баі ў 1944 годзе.

**1990** год — Вярхоўны Савет Беларусі прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Яна складаецца з прэамбулы і асобных артыкулаў. Канстытуцыя і законы рэспублікі з прыняццем гэтага акта набылі прыярытэт над заканадаўствам СССР, хоць не адмаўлялася знаходжанне Беларусі ў яго складзе. Суверэнітэт зацвярджаўся ў імя вышэйшых мэт — свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна рэспублікі на аснове забеспячэння правоў асобы. Прыняцце Дэкларацыі абумовіла развіццё прававых нормаў: грамадзянства Беларусі, непадзельнасць і недатыкальнасць тэрыторыі, уласнасць беларускага народа на зямлю, нетры, паветраную прастору, нацыянальныя, культурныя і гістарычныя каштоўнасці, права на стварэнне сваіх фінансава-крэдытнай і грашовай сістэм, права заключаць саюзы з іншымі дзяржавамі і выходзіць з іх і г.д. 5 жніўня 1991 года 5-я пазачарговая сесія Вярхоўнага Савета надала Дэкларацыі статус канстытуцыйнага закона.

**Было сказана**

**Кузьма Чорны (1900—1944), празаік, драматург, публіцыст:**

*«Маленькія і нязначныя здарэнні слабым здаюцца вялікімі і страшнымі. Вялікія і страшныя здарэнні моцным здаюцца маленькімі і нязначнымі».*

*Віншуем з 50-годдзем старшую медсястру* ***Святлану Леанідаўну СКРЫГАН.*** *Жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця і ўсіх жыццёвых даброт.* ***Калектыў Быстрыцкай УБ.***

# ГЭТА ПРОСТА!




**На гэтым тыдні ў сталіцы размешчаны білборды з Максам Мірным. Сюжэты дэманструюць магчымасці заняткаў спортам у парках, дварах, на стадыёнах, бег па алеях і лесвіцах, практыкаванні на лаўцы і брусах. Такім з'яўляецца першы этап інфармацыйна-асветніцкай кампаніі «Быць здаровым — гэта проста!» Прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь і Міністэрства адукацыі.**

Паводле слоў прадстаўніка ЮНІСЕФ Юрыя АКСАМІТНАГА, кампанія спрабуе даць падлеткам простыя і даступныя інструментарый для заняткаў спортам, матываваць моладзь на трэніроўкі не менш як 3-4 разы на тыдні па 30-40 хвілін, што неабходна для захавання здароўя і падтрымкі добрай фізічнай формы.

Інфармацыйна-асветніцкая кампанія «Быць здаровым — гэта проста!» разлічана на бліжэйшыя тры гады. Білборды будуць таксама размешчаны ў гарадах, дружалюбных да моладзі (сёння іх 21). Наступным этапам кампаніі стане комплекс практыкаванняў, які будзе распрацаваны Максімам і Рэспубліканскім цэнтрам фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў з улікам патрэб падлеткаў. Відэатрэніроўкі будуць даступныя на сайце www.unicef.by. Таксама відэатрэніроўкі будуць выдадзены на электронных носьбітах для распаўсюджвання ва ўстановах адукацыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**ААТ «Белгандальбуд»**

**вiншуе ўсіх калег, і ў першую чаргу работнікаў свайго прадпрыемства, з прафесійным святам —**

***ДНЁМ РАБОТНІКАЎ ГАНДЛЮ!***

**Зычым усім плённай працы, актыўнага росту і новых вяршынь. Няхай здароўе будзе моцным, настрой — бадзёрым, прыбыткі — стабільнымі, а спажыўцы сферы гандлю — задаволенымі!**



# СМЕХ
## (АЎЦЮКОЎСКІ ТРАКТАТ)


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**СМЕХ — ПРЫНЦ СУР'ЁЗНЫ:**

прывабны, як «Алёнка»;
прынадны, як «Альварыя»;
прыемны, як «Бульбаш»;
патрэбны, як вітамін;
прыцягальны, як рыбалка;
мужны, як Вярнідуб;
капрызны, як бландзінка.

**СМЕХУ БЫВАЕ БАГАТА І МАЛА:**

перасмяешся — баліць жывот;

стрымліваешся — дуюцца шчокі;

часта ўжываеш — рагатун;

без меры — дурань;

гумару не разумееш — чмыр.

**СМЯЮЦЦА КОЖНЫ ПА-СВОЙМУ:**

адзін — у падушку, каб ніхто не чуў;

другі — на ўсю Іванаўскую;

трэці — як парася свянцонае;

чацвёрты — як з гары едучы;

пяты — як вада з балота, што яно зыбаецца;

шосты — як кацёл з гаршка, што ён чорны;

сёмы — як лысы з пляшывага;

усе ведаюць: смех не арэх — зуб не лупіць, пасмяяцца — не пакалечыць.

**СМЕХ, АДНАК, МОЖА І ДА ПЛАЧУ ДАВЕСЦІ:**

калі цябе пад'юдзілі для смеху за гарачы камень ухапіцца;

калі табе няймецца пакараеднічаць з начальствам;

калі паводзіш пасабачы — ліжаш і гаўкаеш без разбору;

калі вядзеш пустую жытку і маеш пусты смех;

за ўсё гэта давядзецца цалаваць вогненную патэльню на тым свеце.

**СМЕХ ЖЫВЕ Ў РОЗНЫХ МУНДЗІРАХ:**

народны — у анекдотах, жартах, падколках, прыколках, прыпеўках, забабонах, прыказках, прымаўках, прыкметах;

прыдуманы — у камедыях, сцэнках, мініяцюрах, клубах вясёлых і знаходлівых, «камеды клабах»;

высмактаны — у гумарыстычных вершах, байках, фельетонах, прысвячэннях, пародыях, эпітафіях;

святочны — на фестывалях, фэстах, вяселлях, хрэсьбінах, дыскатэках, вечарынках, юбілеях, імянінах і пры сустрэчы трох выпівох;

розны, ад якога можна кіснуць, класціся, лопнуць і, урэшце, памерці.

**СМЕХУ ВАРТЫ ЎВЕСЬ ЗЯМНЫ РАЙ:**

нашы будзённыя звягі, падножкі, зайздрасць;

гульня ў аклады і пасады, кабінеты і манеты;

чаканне медалёў, значкоў, званняў, прэмій, грамат, падзяк;

шлюбныя допыты, роспыты, katавaнні: «Дзе быў?..», «Дзе была?..»;

спадзяванні на дзяцей, начальства, надвор'е, чарадзейства, магію, варажбу, іншапланецян;

барацьба з перхаццю, дыхавіцай-задышкай, аблысеннем, сівізной і надзея на даўгалецце;

вайна з чортам лазатым, каб не аддаць яму душу, не трапіць на яго рогі, у зубы, каб ён не цягаў за язык і не насіў чорт ведае дзе, з кім і немаведама для чаго;

калі з усяго гэтага не смяюцца, не цешыцца, то можна й павесіцца.

Ведай, чалавек, лепш жартаваць, чым гараваць. Пажыві па-людску, а сабакам быць паспееш. Давайма жыць весела і дружна, з міласцю і любасцю адно да аднаго.

**Уладзімір ЛІПСКІ.**

**P.S.** *Што да гэтага дадаць? Хіба тое, 27—28 ліпеня ў Калінкавіцкім раёне ладзіцца чарговы, сёмы па ліку, фестываль народнага гумару «Аўцюкі-2012»; што на яго, як плануецца, з'едуцца гумарысты — як аматарскія калектывы, так і асобныя выканаўцы — з усіх куточкаў краіны...*

*Каб разам са шматлікімі гасцямі пашвэндацца (гэта ўжо па традыцыі) па аўцюкоўскіх вуліцах і падворках, накаштавацца рознай смакаты, наслухацца розных (у тым ліку рэдкіх — мясцовых...) анекдотаў і баек, стаць сведкамі адкрыцця Музея народнага гумару і (гэта ўжо само сабой) выступіць.*

*Як абяцаюць арганізатары, канцэртаў, конкурсаў, тэатралізаваных дзеянняў, масавых гульняў, пачастункаў і сувеніраў хопіць на ўсіх.*

*Застаецца прыехаць.*

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.



## «ПЕСНЯ І КАЗКА ХОДЗЯЦЬ У ПАРЫ» (Усе словы крыжаванкі пачынаюцца з літары К).

**Па гарызанталі: 1.** Форменны знак на форменнай фуражцы. **4.** Птушка, якая, паводле беларускага фальклору, звязвае жывых са светам памёрлых. **6.** Час не ... : не падгоніш і не прыпыніш (прык.). **9.** Жыве ... і сабака, ды жытка не аднака (прык.). **10.** Баравік, які вырастае ў час каласавання жыта. **14.** «А старанны будзеш,\\Да навукі здатны -\\Я прадам кароўку\\І ... астатні». З верша Якуба Коласа «У школку». **15.** Пасмяяўся ... з гаршка, што той чорны (прык.). **16.** «Вось прыбраў наш дзед калёсы,\\... дзёгцем квацануў». З вершаванай казкі Я. Коласа «Дзед і мядзведзь». **17.** «У песнях жа родны ..., родныя словы\\Жылі і жывуць, і жыць будуць заўсёды». З верша Янкі Купалы «Родныя песні». **20.** «Купіў слонік парасонік,\\Скача з ім, нібыта ...». З верша А.Старынчыка «Слон і парасон». **21.** «Песня і ...\\Ходзяць у пары,\\Сеюць па свеце\\Дзівы і чары». З верша Я. Купалы «Песня і ...». **26.** Вясельны чын, які павінен быў выкупіць кубел з пасагам у сваякоў маладой. **28.** «Мой родны ..., як ты мне мілы!». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». **29.** ... любіць сытага, а цэп — галоднага (прык.). **30.** «Як ..., льецца, рвецца\\З сэрца песня ў свет за светы». З верша Я. Купалы «Песня». **31.** Жалезны конь, у жываце агонь, есці не просіць, а жне і малоціць (заг.).

**Па вертыкалі: 2.** Востры край, рабро чаго-небудзь. **3.** «Зямля, плуг і каса — гэта наша ...». З верша Я. Купалы «Касцам». **5.** Не злуйся вельмі: ... папсуеш (прык.). **6.** Эстрадны танец з высокім падкідваннем ног. **7.** «Што мне пан, што мне ...?! -\\Цэлы свет мне адкрыт!». З верша Я. Купалы «З песень беларускага мужыка». **8.** Замазка для акон. **11.** «Перад намі, ...,\\Светлы шлях адкрыты». З верша Я. Купалы «Якубу Коласу». **12.** Жаночы касцюм для купання. **13.** Струнны смычковы музычны інструмент. **18.** Арэх какосавай пальмы. **19.** «Люблю цябе звонка,\\Люблю цябе, ...». З верша Максіма Танка «За песні і сасонкі». **22.** «Чуў, ..., сонца, бачыў гром?» (прык.). **23.** Часам і ... далёка заскача (прык.). **24.** Сам сляпы, а сляпому дарогу паказвае (заг.). **25.** «Па надворку певень ходзіць,\\За сабою ... водзіць». З верша Я. Коласа «Храбры певень». **27.** Пасеяўшы — хоць ..., а не сеяўшы — ні снапа (прык.).

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ:**

**Па гарызанталі:** 1. Кукарда. 4. Крумкач. 6. Конь. 9. Кот. 10. Каласавік. 14. Кажух. 15. Кацёл. 16. Колы. 17. Край. 20. Конік. 21. Казка. 26. Кубельнік. 28. Кут. 29. Каса. 30. Крыніца. 31. Камбайн. **Па вертыкалі:** 2. Кант. 3. Краса. 5. Кроў. 6. Канкан. 7. Кат. 8. Кіт. 11. Колас. 12. Купальнік. 13. Кантрабас. 18. Какос. 19. Краіна. 22. Кум. 23. Кляча. 24. Кій. 25. Куры. 27. Капа.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.15 | 21.16 | 16.01 |
| Віцебск | 4.59 | 21.12 | 16.13 |
| Магілёў | 5.05 | 21.06 | 16.01 |
| Гомель | 5.09 | 20.55 | 15.46 |
| Гродна | 5.32 | 21.30 | 15.58 |
| Брэст | 5.40 | 21.24 | 15.44 |

## Месяц

***Першая квадра 26 ліпеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

## Імяніны

*Пр. Анісіма, Івана, Сцяпана.*
*К. Марты, Наталлі, Юліі, Рудольфа, Фелікса, Юрыя.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Калі ты на дыеце, памятай залатое правіла: «Хочаш есці — еш яблык. Не хочаш яблык — не хочаш есці».**

Прыходзіць мужчына да знаёмых, дзверы адчыняе малы сын.

— Тата дома?

— Не.

— А калі будзе?

— Праз 5 гадзін, 17 хвілін, 33 секунды.

— Адкуль такая дакладнасць?

— Мой тата — касманаўт, і мяне ён прывучыў да дакладнасці.

— А мама дома?

— Не...

— А калі будзе?

— Вой, не ведаю! Яна ў цырульню пайшла.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3267.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2012 года.